У бой вёў начальнік штаба



Летам 1944 года воіны 262-й стралковай дывізіі вызваліцелямі прайшлі па беларускай зямлі. Іх шлях у аперацыі «Багратіён» пачаўся на Смаленскай зямлі яшчэ восенню 1943 года. Тады, у верасневскія дні, там, на Смаленшчыне, здзейсніў свой подзвіг наш зямляк, ураджэнец вёскі Оўсішча Беліцкага сельсавета, начальнік штаба 940-га стралковага палка, маёр Аляксей Дзмітрыевіч Мацюшаў.

Падпалкоўнік Арзамасцаў паклаў тэлефонную трубку. Выконваючы абавязкі начальніка штаба капітан маўчаў. Ён чакаў, што скажа камандзір палка. А той не спяшаўся. Рука яго ўсё ляжала на тэлефоннай трубцы, як быццам бы ён чакаў, што камандзір дывізіі пазвоніць і скажа яшчэ штосьці. І Арзамасцаў, ускінуўшы галаву, сказаў:

— Рыхтуйцеся, капітан, да сустрэчы начальніка штаба.

— Прызначылі? — радасна перапытаў капітан.

— Так, выехаў да нас маёр Мацюшаў, — адказаў яму камандзір палка.

— Хто ён такі?

— Баявы камандзір, узнагароджан ордэнам Чырвонага Сцяга і медалём «За адвагу». У баях — з першых дзён, былы пагранічнік, вучыўся на шасцімесячных курсах пры Акадэміі імя Фрунзе.

— Вельмі прыемна, — узрадавана сказаў капітан. Ён узняўся, звярнуўся да камандзіра палка:

— Дазвольце, таварыш падпалкоўнік, ісці ўсё падрыхтаваць.

— Ідзіце, капітан, рыхтуйце.

Маёр Мацюшаў у першай жа гутарцы спадабаўся падпалкоўніку Арзамасцаву. Быў ён нетаропкі, але,бачна па ўсяму, энергічны. Умеў уважліва слухаць, з адказамі не спяшаўся і не марудзіў, адказваў дакладна, удумліва. Арзамасцаву заўсёды падабаліся людзі такога складу, з імі добра працаваць і ў баі яны — верная апора. Калі новы начальнік штаба пайшоў знаёміцца з падначаленымі, камандзір палка заняўся сваімі клопатамі

...Ішлі дні. У абароне яны здаваліся падобнымі адзін на другі, але праляталі хутка. Пяць месяцаў полк разам са сваёй дывізіяй стаяў на адным месцы. Працы было шмат. Асабліва многа — у Аляксея Дзмітрыевіча Мацюшава. Камандзір палка гаварыў яму, што многае павінны рабіць падначаленыя. У такіх выпадках начальнік штаба сур'ёзна і ціха адказваў: «Я раблю не таму, што не давяраю. Проста лічу, што начальнік штаба павінен у любую мінуту ўсё ведаць і рабіць».

Камандзір палка, на імгненне задумаўшыся над адказам Мацюшава, згадзіўся з маёрам, і ўсё ішло сваёй чаргой. А калі аднойчы, прыбыўшы ў размяшчэнне батальёна, падпалкоўнік Арзамасцаў пачуў як з салдатамі гаварыў Мацюшаў, ён больш не заводзіў размовы, што не трэба за іншых рабіць іх справу. Тады камандзір палка добра зразумеў, што начальнік штаба робіць сваю прамую справу — рыхтуе ўсімі спосабамі полк да наступальных баёў.

...Наступленне дывізіі пачалося 15 верасня 1943 года. Калі полк таксама перайшоў у наступленне, ніхто не ведаў, што насталі апошнія, самыя яркія дні жыцця начальніка штаба маёра Аляксея Дзмітрыевіча Мацюшава. Затое ён добра ведаў другое: пачалося тое, аб чым ён і ўсе воіны марылі гэтыя пяць месяцаў знаходзячыся ў абароне на Смаленскай зямлі. Начальнік штаба радаваўся гэтаму можа больш іншых, бо наступленне нашых часцей адкрывала дарогу на родную беларускую зямлю. І хто ведае, можа лёс будзе такім літасцівым, прывядзе яго ў родную вёску Оўсішча на Сенненшчыне, адкуль ён, настаўнік Латыгальскай школы, пайшоў у 1937 годзе на службу ў армію, потым вучоба ў вучылішчы пагранічных войск, зноў служба на граніцы. А потым вайна. Не прайшло і месяца з яе пачатку, як Віцебшчына аказалася акупіраванай фашыстамі. Там, у роднай вёсцы, засталіся яго бацькі. Нічога не ведаў аб іх лёсе Аляксей Дзмітрыевіч. І цяпер, калі полк пайшоў уперад, маёр жадаў быць у баі, ісці наперад, каб адным з першых уступіць на родную зямлю.

18 верасня дывізію ўвялі ў прарыў і загадалі ў напрамку вёскі Вераб'і ўвесці перадавы атрад.

— Настаў час, Аляксей Дзмітрыевіч, — сказаў камандзір палка, і ён паставіў перад ім баявую задачу. Удакладніўшы абстаноўку, начальнік штаба стралковага палка маёр Мацюшаў сам павёў у бой дзве роты байцоў з двума батарэямі гармат. Фашысты былі выбіты з вёсак Башкова, Бухіна. Перадавы атрад падышоў да вёскі Вераб'і. Маёр ведаў, што гітлераўцы ператварылі яе ў моцны апорны пункт. Каб не несці вялікія страты, ён прыняў рашэнне абысці Вераб'і і адрэзаць фашыстам шляхі адыходу, а потым атакаваць. План быў дакладны. Сутычка за смаленскую вёску была жорсткай. У гэтым баі былі акружаны і знішчаны каля двухсот варожых салдат і афіцэраў.

А назаўтра, 19 верасня, у час бою за вёскі Георгіеўская і Змітракі Мацюшаў з узводам аўтаматчыкаў і двума ўзводамі 45-міліметровых гармат зайшоў у тыл ворага. Воіны адрэзалі групу з васьмідзесяці гітлераўцаў і разбілі яе.

Рухаючыся далей, байцы нечакана сустрэліся з двума ротамі праціўніка. Сілы былі няроўнымі.

— Нас мала, фашыстаў больш. Але мы павінны іх атакаваць і выйграць бой, — сказаў байцам маёр Мацюшаў, і ён першым кінуўся на фашыстаў. Больш ста гітлераўцаў знайшлі сабе магілу ў гэтым баі.

— Мы бачылі, як маёр Мацюшаў, — успамінае адзін з удзельнікаў бою Васіль Мікалаевіч Сіткін, — перабягаў, прыгнуўшыся, кароткімі перабежкамі. Было бачна, што нямецкі кулямётчык вядзе па ім прыцэльны агонь. Геройскай смерцю загінуў у гэтым баі камуніст Мацюшаў. Воіны працягвалі наступленне.

У горадзе Дзямідаве Смаленскай вобласці пахавалі загінуўшага маёра Аляксея Дзмітрыевіча Мацюшава. Камандзір палка падпалкоўнік Арзамасцаў тады сказаў:

— Яго подзвіг даў магчымасць палку з найменшымі стратамі разбіць апорныя пункты супраціўлення праціўніка і развіць поспех наступлення.

Маёру А. Д. Мацюшаву пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Імем нашага земляка названа Латыгальская васьмігадовая школа і піянерская дружына гэтай школы.

Н. САЛАЎЁЎ.